Медыяпрастора

Як наша слова адгукнецца

З 1 снежня ў Беларусі ўступілі ў сілу змяненні ў закон аб сродках масавай інфармацыі. Сярод найбольш заўважных абнаўленняў — афіцыйна ўведзены ў медыяполе тэрміны «сеткавае выданне», «інтэрнэт-рэсурс» і іншыя, упершыню дакладна ўстаноўлены правы і абавязкі ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў, пашыраны пералік забароненай да распаўсюджання інфармацыі, а таксама зацверджаны аб'ём перадач нацыянальнай вытворчасці — так, за два гады ўсе айчынныя тэлеканалы павінны мець як мінімум 30 % перадач уласнага беларускага кантэнту.

Каментуючы новаўвядзенні падчас анлайн-канферэнцыі Белтэлерадыёкампаніі, **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Павел ЛЁГКІ** адзначыў, што ў 2008 годзе, калі прымалася папярэдняя рэдакцыя закона аб СМІ, у інтэрнэце працавала значна менш сродкаў масавай інфармацыі: «Сёння сітуацыя абсалютна іншая, як вы самі бачыце. З'яўляюцца новыя пагрозы, новыя выклікі, і заканадаўства павінна на гэтыя пагрозы і выклікі таксама рэагаваць. Да таго ж сама медыясфера інтэнсіўна развіваецца, так што ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у закон аб СМІ — гэта патрабаванне часу».

У прыватнасці, зазначыў першы намеснік міністра, цяпер закон дазваляе інтэрнэт-рэсурсам, якія добраахвотна здзейсняць дзяржаўную рэгістрацыю ў якасці сеткавых рэсурсаў, атрымаць дакладна такія ж правы, якія маюць друкаваныя і электронныя сродкі масавай інфармацыі: магчымасць наведваць масавыя мерапрыемствы і дзяржаўныя органы ў якасці журналістаў, атрымліваць акрэдытацыю і г. д.

Акрамя таго, раней Павел Лёгкі расказаў у інтэрв'ю тэлеканалу СТБ, што міністэрства падрыхтавала больш лаяльныя кваліфікацыйныя патрабаванні да кіраўнікоў як друкаваных, так і сеткавых СМІ: «Паводле ранейшага заканадаўства, *галоўным рэдактарам СМІ мог быць чалавек, які пяць гадоў адпрацаваў на кіруючых пасадах у СМІ. І мы добра разумеем, што гэта патрабаванне ўстарэла, таму прапанавалі пяцігадовы цэнз знізіць да трох гадоў. І самае галоўнае, не ставіць умову, каб абавязковай была работа на працягу пяці або трох гадоў на кіруючых пасадах. Гэта значыць, калі ты тры гады працуеш на інтэрнэт-рэсурсах, то незалежна ад таго, якія пасады займаў, ты маеш права прэтэндаваць на пасаду галоўнага рэдактара сеткавага рэсурсу»*.

Шмат абмеркаванняў выклікаў устаноўлены законам парадак папярэдняй ідэнтыфікацыі карыстальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў і сеткавых СМІ. Нагадаем, паводле зацверджанага Саветам Міністраў Беларусі палажэння, каб размяшчаць на сайце паведамленні ці матэрыялы, у тым ліку каментарыі, карыстальнікі мусяць заключыць адпаведнае пагадненне з інтэрнэт-рэсурсам, стварыць уліковы запіс і актываваць яго, пацвердзіўшы сваю асобу праз СМС-ідэнтыфікацыю (адзін тэлефонны нумар — адзін уліковы запіс на сайце), альбо іншымі спосабамі, напрыклад праз сацыяльныя сеткі ці электронную пошту. Выбар спосабу ідэнтыфікацыі карыстальніка застаецца за ўладальнікам інтэрнэт-сайта, пры гэтым звесткі пра карыстальніка і ўсе змешчаныя ім матэрыялы захоўваюцца на серверах цягам года пасля скасавання карыстальніцкага пагаднення.

«Механізм ідэнтыфікацыі будзе садзейнічаць памяншэнню колькасці правапарушэнняў у інтэрнэце, знізіць рызыкі ўладальніка сайта, якія могуць быць звязаны з размяшчэннем карыстальнікамі супрацьпраўнай інфармацыі, а таксама павысіць узровень сеткавай адукаванасці і прававой культуры паводзін у інтэрнэце», — падкрэсліла **начальнік упраўлення прававога забеспячэння і кантролю за выкананнем заканадаўства Міністэрства інфармацыі Вікторыя МЯЛЕШКА.**

Вікторыя ЗАХАРАВА.

АГОНЬ НЕ ТОЛЬКІ ГРЭЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паказальна, што ўсе гэтыя выпадкі здарыліся ў начны час сутак, калі магчымасць таго, што нехта заўважыць своечасова пажар, вельмі імкліва змяншаецца.

— Меркаваная прычына большасці пажараў — неасцярожнае абыходжанне з агнём, — кажа **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Сцэнарый, які папярэднічае трагедыі, адзін і той жа: чалавек курыць, засынае, палаючая цыгарэта вывальваецца і прапальвае коўдру або вопратку. Яны пачынаюць тлець і вылучаць дым і чадны газ, які чалавек не ў стане ўнюхаць у сне. Таму мы заклікаем устанавіць аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі — магчыма, гэты невялікі прыбор уратуе менавіта ваша жыццё.

Ратавальнікі таксама нагадваюць, як абагрэцца бяспечна.

— Калі вы карыстаецеся электрычным ацяпляльнікам, то не пакідайце яго без нагляду і ўключаным на ноч, — раіць Віталь Навіцкі. — Абагравальнік — прыбор, які спажывае шмат электрычнасці, таму нельга ў адну разетку з ім падключаць яшчэ што-небудзь. Яго трэба ўсталяваць на адлегласці некалькіх метраў ад фіранак. Калі ж электрычны абагравальнік загарэўся, то яго трэба абясточыць: або вырваць шнур сілкавання з разеткі, або рубільнікам у электрашчытавой. Калі полымя невялікае, то накрыйце прыбор шчыльнай коўдрай — так вы перакрыеце доступ кіслароду. Але калі за некалькі хвілін справіцца з агнём не ўдалося, то выклікайце ратавальнікаў па нумары 101 або 112. Калі ж у вас дома стаіць печка, то юшку трэба зачыняць толькі пасля таго, як згаслі ўсе вугалькі, інакш вы рызыкуеце атрымаць атручэнне чадным газам.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Армія

ПАД АХОВАЙ «ТОРАЎ»

1 снежня 2018 года стала эпахальнай датай у гісторыі беларускай арміі. На баявое дзяжурства заступілі воіны-зенітчыкі 1146-га гвардзейскага зенітнага ракетнага палка. Ім належыць прыкрываць вельмі важны дзяржаўны аб'ект — Беларускую атамную электрастанцыю. І, канешне, паветраную прастору на паўночна-заходнім аператыўным напрамку.

Фота БелТА.

Паветраныя межы ахоўваюцца найноўшым зенітна-ракетным комплексам «Тор-М2». У сваім класе ён лічыцца найлепшым у свеце. Комплекс можа знішчаць адначасова да чатырох цэляў.

— Пачатак снежня ва Узброеных Сілах — старт новага навучальнага года, — адзначыў **камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны генерал-маёр Ігар ГОЛУБ.** — Мы выканалі ўсе падрыхтоўчыя мерапрыемствы. Тэхніка пераведзена на зімовы рэжым эксплуатацыі. 1146-ы зенітны ракетны полк заступае на баявое дзяжурства. Гэта першая задача для войскаў ВПС і ППА. Полк сфарміраваны ў новым складзе год назад у Баранавічах. 1 чэрвеня яму быў уручаны Баявы сцяг ужо ў новым гарадку непадалёк ад Астраўца.

На працягу года полк выконваў элементы зладжвання, якое скончылася баявымі стрэльбамі падчас аператыўна-тактычных вучэнняў на расійскім палігоне Ашулук. Перад палком стаяла складаная задача. У якасці імітатараў паветраных цэляў выкарыстоўваліся крылатыя ракеты на малых вышынях, беспілотнікі. Полк справіўся на адзнаку «выдатна».

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю АБРАМОВІЧА Аляксандра Міхайлавіча, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Аляксандр Міхайлавіч назаўсёды застанецца ў нашай памяці як выдатны дзяржаўны дзеяч, які ўнёс вялікі ўклад ва ўмацаванне беларускай дзяржаўнасці.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю былога старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь АБРАМОВІЧА Аляксандра Міхайлавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.

Здарэнні

Школьнікі праваліліся пад лёд

Адзін з выпадкаў адбыўся на сярэдзіне возера ў Драгічыне.

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, на адлегласці 500—600 метраў ад берага тануў хлопчык — вучань 4 класа мясцовай школы. Дабраўшыся да палонкі, ратавальнікі ўбачылі, што яго дасталі з вады рыбакі, якія знаходзіліся на возеры. Работнікі МНС пры дапамозе лесвіцы-палкі даставілі яго на бераг для агляду брыгадай медыкаў. Школьнік быў шпіталізаваны ў раённую бальніцу з папярэднім дыягназам «агульнае пераахаладжэнне». Высветлілася, што хлопчык і яго старэйшы брат пайшлі на возера катацца на каньках. У нейкі момант пацярпелы трапіў у прамывіну і праваліўся пад лёд.

А вось у Добрушскім раёне ў рацэ Іпуць падлетак патануў. Таксама два браты выйшлі з санкамі на лёд ракі і ў нейкі момант абодва праваліліся. Адзін з братоў зваліўся ў ваду недалёка ад берага і змог выбрацца самастойна. Ён адразу ж пабег за бацькам. Дом знаходзіўся прыкладна за 70 метраў ад берага. Аднак выратаваць 14-гадовага хлопца не атрымалася — яго знесла цячэннем ракі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белбакалея», г. Минск, ул. Промышленная, 15

Предмет аукциона
Месторасположение – г. Минск, ул. Промышленная, 15

№ лота	Инв. номер по бухучету	Наименование	Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб.
1	9457	**Штабелер Rocla SW12AC DS 3600**, серийный № 5523160, г. в. 2005	**9 396,00**
2	9947	**Штабелер PRAMAC LX 16/29**, серийный № PL1001797, г. в. 2008	**10 584,00**
3	10051	**Штабелер PRAMAC LX 16/29**, серийный № LL10006464, г. в.2010	**10 584,00**
4	10338	**Штабелер STILL EGV 16**, серийный № 710250CO8154, г. в. 2012	**19 008,00**
5	10337	**Штабелер STILL EGV 16**, г. в. 2012	**11 016,00**
6	9673	**Штабелер Rocla SW16ac TR 5400**, серийный № 5705105, г. в.2007	**12 528,00**
7	9678	**Штабелер Rocla SW16ac TR 5400**, серийный № 5701114, г. в.2007	**12 528,00**
8	10450	**Штабелер Ричтрак BT Reflex RRE140**, рама № 6285293, г. в.2014	**44 064,00**

Условие самовывоза	Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по вывозу предмета аукциона

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 18.12.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**